# Дабіцца належнага выніку

### Прэзідэнт заклікае знайсці новыя падыходы ў барацьбе з праблемай курэння

**Аб гэтым Аляксандр Лукашэнка заявіў на нарадзе па пытаннях абароту і спажывання тытунёвых вырабаў і электронных сістэм курэння, паведаміў карэспандэнт БЕЛТА.**

«Мы бачым, што людзі па-ранейшаму кураць, і адных забаронных мер недастаткова, — адзначыў Прэзідэнт. — Не сакрэт, што забаронены плод заўсёды салодкі для пачынаючых курцоў. А курцам са стажам патрэбна моцная матывацыя для адмовы ад курэння. Настаў час для пошуку новых шляхоў вырашэння гэтай праблемы, якія будуць улічваць рэальны стан спраў і псіхалогію людзей».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што сусветны вопыт і практыка паказваюць, што для дасягнення выніку патрэбны не татальныя забароны, а прадуманы комплекс мер. «Адміністрацыйныя абмежаванні павінны арганічна спалучацца з рознымі стымуламі, заахвочваннямі і інфармацыйнай работай. Асноўная роля тут адводзіцца медыкам, журналістам, педагогам, ідэолагам», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Паводле слоў Прэзідэнта, у Беларусі праблема спажывання тытунёвых вырабаў застаецца сур'ёзнай. Нягледзячы на меры, што прымаюцца, у краіне курыць амаль палавіна мужчынскага насельніцтва, усё часцей гэту згубную прывычку мае моладзь. «Больш таго, з'яўляюцца новыя прадукты для імітацыі курэння, што наносяць не меншую шкоду здароўю, чым тытунь. Размова ідзе аб электронных цыгарэтах, якія становяцца ўсё больш папулярнымі. Яны прыцягваюць сваёй незвычайнасцю, даступнасцю, адсутнасцю інфармацыі аб шкодзе іх выкарыстання. Ды і не ўсе згаджаюцца з тым, што яны шкодныя настолькі, наколькі шкодныя традыцыйныя цыгарэты», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што падставай для гэтай размовы стаў праект дэкрэта, які ўнесены на яго разгляд. «Дакумент сур'ёзны. Я яго павінен разгледзець і падпісаць. Але палічыў неабходным па праблемах, якія адносяцца да праекта гэтага дэкрэта, яшчэ раз параіцца, вярнуўшыся ў цэлым да пытанняў вытворчасці і спажывання тытунёвых вырабаў», — заявіў Прэзідэнт.

Ён нагадаў, што дэкрэт, прызначаны знізіць спажыванне тытуню жыхарамі Беларусі, быў прыняты яшчэ ў 2002 годзе, і неабходныя змяненні ўносяцца ў яго рэгулярна. «Але належнага выніку, на які мы разлічвалі, пакуль няма. Таму, па-першае, нам трэба прааналізаваць, як выконваюцца палажэнні дэкрэта ў дзеючай рэдакцыі і якіх зрухаў удалося дасягнуць. Па-другое (аб адказных за рэалізацыю яго норм), наколькі эфектыўна мы адсочваем вынікі праводзімай работы?» — паставіў пытанні кіраўнік дзяржавы.

Новым праектам дэкрэта, у прыватнасці, прапануецца прыраўноўваць электронныя цыгарэты да тытунёвых вырабаў і пашырыць пералік месц, у якіх курэнне забараняецца. «Аднак паўстае пытанне, ці прынясуць гэтыя меры чаканы эфект? — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Мы павінны абмеркаваць, ці ўсё прадугледжана ў праекце дэкрэта, ці ёсць альтэрнатыўныя шляхі для зніжэння тытунекурэння ў Беларусі?»

Міністр аховы здароўя Васіль Жарко на нарадзе расказаў, што спажыванне тытуню наносіць істотную шкоду здароўю грамадзян, а гэта, у сваю чаргу, кладзецца цяжарам на грамадства і дзяржаву. «Тытунекурэнне з'яўляецца адным з асноўных фактараў рызыкі развіцця неінфекцыйных захворванняў, іх ускладненняў і заўчаснай смяротнасці», — падкрэсліў ён.

Паводле даных міністра, у Беларусі на долю неінфекцыйных захворванняў прыпадае каля 86 працэнтаў усіх хвароб і 82 працэнты смерцяў. «У 2015 годзе смяротнасць мужчын працаздольнага ўзросту перавышала значэнне аналагічнага паказчыку ў жанчын у 4 разы. А па асобных прычынах — хваробы сістэмы кровазвароту, злаякасныя наватворэнні — да 7 разоў. У тытунёвым дыме знаходзіцца больш за 90 вядомых канцэрагенаў і каля 250 таксічных злучэнняў», — сказаў Васіль Жарко.




■ Пра гэта гаварылася на сходзе

# ПРАЕКТ... СТРАЦІЎ АКТУАЛЬНАСЦЬ

### Чаму не заўсёды даюць эфект інавацыйныя сродкі дзяржаўнай падтрымкі?

**Пытанні эканомікі, інвестыцый у актуальныя праекты, скіраваныя на выпуск канкурэнтнай прадукцыі і стварэнне новых рабочых месцаў, сёння для краіны ключавыя. Прычым задача не толькі ў прыцягненні замежнага капіталу, але і ў эфектыўным выкарыстанні сродкаў дзяржаўнай падтрымкі. Ці заўсёды яны трацяцца прадумана? На жаль, не, у чым пераканаўся Камітэт дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці, прааналізаваўшы, як прадпрыемствы харчовай галіны выкарысталі сродкі дзяржпадтрымкі на тэхнічнае пераўзбраенне вытворчасці.**

У 2013 годзе Слонімскі віна-гарэлачны завод распачаў рэалізацыю праекта па арганізацыі вытворчасці пладовых дыстылятаў і на іх аснове высакаякасных алкагольных напояў, у тым ліку кальвадосаў. Перспектыва, мусіць, яго ініцыятарам здавалася някепскай, аднак не ўлічылі «дробязь», што такой жа прадукцыяй могуць заняцца і іншыя. З рашэннем аб фінансаванні гэтага інвестпраекта прамарудзілі, і ён... страціў сваю актуальнасць. У 2015 годзе Пінскі вінаробны завод рэалізаваў падобны праект, цалкам забяспечыўшы патрэбу беларускага рынку ў пладовых гарэлцы, брэндзі і кальвадосах. А ў Слоніме набытае абсталяванне магутнасцю 300 тыс. дал у год летась загрузілі толькі на 19%. Пры гэтым на праект затрачана 6271,8 млн рублёў, у тым ліку 563 млн руб. сродкаў інавацыйнага фонду Гродзенскага аблвыканкама. У выніку аблвыканкам прыняў рашэнне аб вяртанні гэтай сумы, плюс яшчэ 250,4 млн руб. пені.

Неаднойчы анансаваўся журналістам і яшчэ адзін праект — па стварэнні на Навагрудскім вінзаводзе вытворчасці і разліву ў ПЭТ-бутэлькі квасу браджэння, безалкагольных напояў на аснове рысавага грыба з рэалізацыяй прадукцыі на знешнім рынку. Агульныя затраты склалі 11,5 млрд рублёў, у тым ліку 2145,1 млн рублёў — з інавацыйнага фонду Гродзенскага аблвыканкама. Як жа працуе новая лінія? У 2014 годзе яе магутнасць выкарысталі на 15,4%, летась — на 17,9%.

Бывае і так, што прымаюць непрадуманыя рашэнні па замене часткі абсталявання, трацяць вялізныя грошы, а эфектыўнасць работы лініі ў цэлым не паляпшаецца. Так здарылася на Гродзенскім кансервавым заводзе, дзе на мадэрнізацыю лініі па вытворчасці зялёнага гарошку затрацілі 3,4 мільёна еўра, але запланаванага выніку не дабіліся. Чаму? Бо не замянілі абсталяванне па падрыхтоўцы гэтай прадукцыі, дзе асобныя машыны ўжо стапрацэнтна зношаны. Таму прадукцыйнасць лініі не павялічылася адпаведна праектным разлікам — 4,5 тон у гадзіну, а фактычна складае на сённяшні дзень 1,3 т/г.

Зрэшты, не заўсёды замена абсталявання дае эфект. Слонімскі віна-гарэлачны завод за 2050 млн рублёў набыў стужкавы прэс германскай вытворчасці, які ўжо быў у карыстанні. У 2014 годзе на ім перапрацавалі 5824 тоны яблыкаў, а летась — 4211 тон, альбо 75% ад узроўню 2013-га, калі выпрацоўка соку вялася на старым, менш прадукцыйным абсталяванні.

Усе гэтыя праекты, вядома, падмацоўваліся бізнес-планамі, аднак ці ўсё дакладна пралічылі пры іх распрацоўцы? І калі яны падтрымліваліся з дзяржаўнага інавацыйнага фонду, то наколькі грунтоўна прааналізавалі гэтыя планы на ўзроўні выдзялення сродкаў дзяржпадтрымкі? Гэта тычыцца не толькі аб'ёмаў вытворчасці, а найперш перспектыў рэалізацыі тавару. Ці былі праведзены прадпрыемствам даследаванні рынкаў збыту прадукцыі, якую маюць намер вырабляць? Ці ёсць дамоўленасці з яе патэнцыяльнымі пакупнікамі і наколькі яны рэальныя? Вось, пэўна, што прынцыпова і абавязкова патрэбна ўжо на стадыі распрацоўкі праекта.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**
*prakopchik@zviazda.by*

■ Выбары-2016

# Настрой маёй краіны

**На скрыжаванні дарог, каля двух вакзалаў у Гомелі, правялі пікет па зборы подпісаў у падтрымку прэтэндэнта ў кандыдаты ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў актывісты БРСМ.**

Грамадзянска-патрыятычную акцыю «Маёй краіне» было відаць і чуваць здалёк. Іграла музыка, самадзейныя спевакі прадпрыемства «Гарэлектратранспарт» стваралі настрой гамяльчанам, многія з якіх тут жа, на адкрытай пляцоўцы, пачыналі танцаваць. Прэс-сакратар Гомельскага абласнога камітэта «БРСМ» Арцём Карпенка гаворыць, што падобныя акцыі праходзяць у гэты час на тэрыторыі ўсёй вобласці:

— Дарэчы, мы на сваіх пікетах не толькі агітуем за кандыдата, але і даём розную актуальную інфармацыю. Напрыклад, пра бяспечныя паводзіны на вадзе. Увогуле ж людзі падыходзяць, цікавяцца біяграфіямі кандыдатаў, а потым прымаюць рашэнне: ставіць подпіс ці не.

Пікеты па зборы подпісаў на Гомельшчыне маюць права арганізоўваць 57 ініцыятыўных груп. У параўнанні з папярэднімі парламенцкімі выбарамі ў іх цяпер значна больш магчымасцяў. Мясцовыя ўлады толькі вызначылі пералік некаторых месцаў, дзе нельга арганізоўваць пікеты, што аўтаматычна дае права праводзіць гэту работу практычна паўсюдна.

Цяпер у Гомельскай вобласці акрэдытавана амаль 100 назіральнікаў за парламенцкімі выбарамі. Старшыня абласной тэрытарыяльнай камісіі Мікалай Стош гаворыць, што самымі


Фота БЕЛТА.

актыўнымі арганізацыямі сталі БРСМ, Беларускі Хельсінкскі Камітэт, РГА «Белая Русь», Беларускае грамадскае аб'яднанне ветэранаў, Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

■ Экалогія

# ЗА ЧЫСТАЕ ПАВЕТРА

### Еўрапейскі саюз выдзеліць нашай краіне 14,5 млн еўра на рэалізацыю прыродаахоўных мерапрыемстваў

**Пагадненне аб фінансаванні праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Паляпшэнне якасці паветра і кіраванне навакольным асяроддзем у Беларусі» паміж урадам Рэспублікі Беларусь і Еўрапейскім саюзам падпісалі міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй КАЎХУТА і кіраўнік Прадстаўніцтва Еўрапейскага саюза ў Рэспубліцы Беларусь Андрэа ВІКТАРЫН.**

Праект міжнароднай тэхнічнай дапамогі, бюджэт якога — 14,5 млн еўра, прадугледжвае рэалізацыю мерапрыемстваў, накіраваных на аказанне падтрымкі Беларусі ў правядзенні эфектыўнага маніторынгу выкідаў у атмасферу і радыяцыйнага маніторынгу, удасканаленне кіравання навакольным асяроддзем, мадэрнізацыю інфраструктуры маніторынгу якасці паветра і радыяцыйнага маніторынгу, паляпшэнне экалагічнага кіравання на мясцовым узроўні.

Па словах Андрэа Віктарын, многія выпадкі хвароб і заўчаснай смерці звязаны з забруджваннем паветра, якое, зразумела, не мае межаў. Таму Еўрапейскі саюз зацікаўлены ў ажыццяўленні гэтай праграмы як на карысць беларусаў, так і на карысць людзей, якія жывуць побач, у тым ліку і ў ЕС.



— Праект прадугледжвае як супрацоўніцтва паміж еўрапейскімі і беларускімі экспертамі для абмену досведам, так і пастаўкі абсталявання на суму каля 7 млн еўра, у тым ліку мабільных і стацыянарных станцый для маніторынгу забруджвання паветра, — паведаміла кіраўнік Прадстаўніцтва Еўрапейскага саюза ў Беларусі.

Андрэй Каўхута таксама падкрэсліў, што супрацоўніцтва з Еўрасаюзам вельмі важнае для нашай краіны. І яно выяўляецца не толькі ў выдаткоўванні значных па аб'ёме сродкаў, але і ў выкарыстанні сучаснага абсталявання, тэхналогій, якія забяспечваюць паляпшэнне стану навакольнага асяроддзя і якасці жыцця беларускага народа. Многія сумесныя праекты ўжо рэалізаваны ў нашай краіне.

Падпісанне фінансавага пагаднення — гэта толькі першы крок, пачатак вялікай працы. Наступным этапам стане распрацоўка дакумента праекта — з канкрэтызацыяй усіх мерапрыемстваў, што пералічаны ў фінансавым пагадненні.

**Вераніка КОЛАСАВА.** *kolasava@zviazda.by*